# Калейдаскоп

студзень 2024

**Школьная газета №5 (55)**

*“Наша мова для нас святая, бо яна нам ад Бога даная”*

*Ф. Багушэвіч*






# Паэты і пісьменнікі пра мову

**Калейдаскоп**
**студзень 2024**

## Родная мова

**Вы паслухайце родную мову:**
**Жаўруковаю песняй звініць…**
**Колькі фарбаў, адценняў у слове!**
**Як пявуча ліецца-гучыць!**

**Васількамі, рамонкамі шэпча**
**У квяцістых, раздольных лугах.**
**Гулкім рэхам гамоніць у зарэччы,**
**Салаўінаю трэллю ў гаях.**

**То шчымліва, журботна галосіць,**
**То вясёлкай над борам плыве.**
**Так у госці ласкава запросіць,**
**Так бяседу гасцінна вядзе!**

**Хай жа іскрыцца сонцам вясеннім,**
**Спелым коласам нівы шуміць!**
**У карагодзе кружыць вясельным**
**Веру, мова мая – будзе жыць!**

**Мілагучная і ласкавая!**
**Не згубілася ў цемры вякоў.**
**Мой святы пасаг, мая спадчына –**
**Мова родная, мова бацькоў!**

**Лідзія Полазава**



## СТУДЗЕНЬ

**Студзень студзіць-буры будзіць**

**Ходзіць студзень, студзіць студзень**

*Ходзіць студзень,*
*Студзіць студзень,*
*Цэлы месяц холад будзе.*
*Вецер зябкі шуміць,*
*А мароз яшчэ й трашчыць.*
***А. Дзеружынскі***



### Этымалогія назвы

***Сама назва першага месяца года красамоўна гаворыць пра яго характар: студзень - значыць сцюдзёны. У гэты час на зямлю прыходзілі моцныя халады.***

### Народныя прыкметы месяца

***Студзень - году пачатак, а зіме - палавіна.***
***Студзень хаты студзіць - рана гаспадароў будзіць.***
***Студзень пагодны - будзе год плодны.***
***Калі студзень імглісты - мокры год, калі халодны - позняя вясна і халоднае лета.***

# Народныя традыцыі

**Калейдаскоп**
**студзень 2024**

**Студзень**

1. **Новы год.** ВКЛ перайшло на студзеньскі стыль у 1550 г., Расія — у 1700 г.

6. **Першая, Посная куцця.** Перадкалядная вячэра. Які дзень, такі і год. ***Богаз'яўленне,***

***Тры Каралі.*** Каталікі праводзілі маскіраваны абрад «Тры каралі», або «Гэроды».

7. **Раство Хрыстова.** Пачатак **Каляд.** «Ой, Калядачкі, бліны-ладачкі...». Калядавалі. Насілі «звязду». Паказвалі батлейку, праводзілі ігрышчы («вадзілі казу», «жанілі Цярэшку», «пяклі ката», гулялі ў «Яшчура» і інш.).

9. **Сцяпан.** Даўней дзень найму слуг, батракоў на год. «На святога Сцяпана вышэй слуга за пана».

13. **Шчодрая куцця.** Пачатак **Шчодрага тыдня.** «Мароз, хадзі куццю есці».

14. **Васілле.** Новы год па праваслаўным календары. «Сею, сею пасяваю, з Новым годам

вас вітаю».

18. **Трэцяя, Галодная, Вадапосная куцця.** Апошнія дні Каляд. «Каляда ад'язджае».

19. **Вадохрышча (Кшчэнне).** «Святое Кшчэнне ваду ксціла..., свет ачысціла і ваду наверх

пусціла», «На Вадохрышча завіруха — на Вялікдзень таксама».

20. **Прывадохрышча** — заканчэнне Каляд. Пачатак **Малой вясельніцы** (да посту).

24. **Аксіння.** «Аксіння дарогу перамяце, а корм падмяце». Фядос. «На Фядоса цёпла».

25. **Таццяна.** Свята студэнтаў. Павел. «Вее вецер — будзе вайна».

31. **Апанас,** Гусінае свята. Свята свойскай жывёлы. «Хавай нос у апанасаўскі мароз».



# Папулярызацыя беларускай мовы

**Калейдаскоп**
**студзень 2024**

---

### Дзівосныя авантуры паноў Кубліцкага ды Заблоцкага

**31 студзеня вучні 8 «Б» класа наведалі Магілёўскі абласны тэатр лялек**, дзе паглядзелі **спектакль «Дзівосныя авантуры паноў Кубліцкага ды Заблоцкага»** па п’есе сучаснага беларускага драматурга Сяргея Кавалёва.

Спектакль-казка распавядае пра прыгоды двух паноў, якія, каб не загінуць, павінны зрабіць добры ўчынак.

Акцёры стварылі на сцэне сапраўднае свята, якое захапіла і ўразіла ўсіх гледачоў.

**Настаўнік беларускай мовы і літаратуры Лістраценка Т.М.**



# Юбілейныя даты



## 4 студзеня 155 год з дня нараджэння Ядвігіна Ш.




4 студзеня 1869 года нарадзіўся Ядвігін Ш. (сапр. Імя Антон Іванавіч Лявіцкі) – беларускі празаік, публіцыст, фельетаніст, драматург, паэт, перакладчык, адзін з пачынальнікаў беларускай мастацкай прозы.

Ядвігін Ш. – аўтар зборнікаў апавяданняў «Бярозка» (Вільня, 1912, 1923), «Васількі» (Вільня, 1914), «Апавяданні» (1940, 1946), падарожнага нарыса «Дзед Завала» (Вільня, 1910), кнігі «Успаміны» (Вільня, 1921), няскончанага рамана «Золата», а таксама шэрага рэцэнзій і літаратурна-крытычных артыкулаў.

Духоўны свет пісьменніка напоўнены пачуццём нацыянальнага самаадчування, нацыянальнай самасвядомасці. Для яго стылявой манеры характэрны чуласць да народнага слова і вобраза, дынамічнае, не застылае ў сваіх сувязях і значэннях слова, змястоўнасць формы.

Першыя апавяданні пісьменніка з'яўляюцца мастацкімі апрацоўкамі, інтэрпрэтацыямі народных жартаў, анекдотаў, гутарак, казак, нагадваюць байкі ў прозе і характарызуюцца вострай сатырычнай скіраванасцю.

У рамане «Золата», які стаў ледзь не першай спробай гэтага жанру ў беларускай літаратуры, аўтар спалучае рэалістычныя, рамантычныя і дэтэктыўныя прыёмы і сродкі.

Наватарская заслуга Ядвігіна Ш. і ў развіцці жанру мемуараў. Ён насычае апавядальную плынь гутарковымі зваротамі і фразеалагізмамі, а ў асобе апавядальніка паказвае не раўнадушнага фактографа, а чалавека, ахопленага самымі рознымі пачуццямі.

Сваёй творчасцю выбітны дзеяч беларускай культуры Ядвігін Ш. заклаў традыцыі, якія знайшлі далейшае развіццё ў творах майстроў мастацкага слова.

# Юбілейныя даты



## 8 студзеня 100 год з дня нараджэння Алеся Савіцкага




**АЛЕСЬ САВІЦКІ** (АЛЯКСАНДР АНУФРЫЕВІЧ; 8 студзеня 1924, Полацак — 5 кастрычніка 2015, Мінск) — беларускі пісьменнік, лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі (1970), Джяржаўнай прэміі Беларусі імя Якуба Коласа, кавалер ордэнаў «Знак Пашаны» і Францыска Скарыны.

Нарадзіўся ў сям'і рабочага. У 1939 годзе сям'я пераехала ў Гродна. З 1942 года – партызан атрада «Смерць фашызму», з 1943 года – камандзір падрыўной групы атрада «Бальшавік» брыгады імя Варашылава. У 1944–1945 гг. – у рабоча-сялянскай Чырвонай Арміі, удзельнічаў у вызваленні Літвы, Польшчы, у баях за ўзяцце Берліна. Быў тройчы паранены.

Пасля дэмабілізацыі (1945) працаваў у рэдакцыі полацкай газеты «Бальшавіцкі сцяг» (пазней «Сцяг камунізму»). У 1958 годзе скончыў Літаратурны інстытут у Маскве, у 1961 годзе – аспірантуру. У 1961–1962 гг. – загадчык рэдакцыі выдавецтва «Ураджай», у 1962–1969 гг. – навуковы сакратар Літаратурнага музея Якуба Коласа. У 1969–1973 гг. загадваў сектарам мастацкай літаратуры аддзела культуры ЦК КПБ. З 1973 года на творчай рабоце.

Першае апавяданне «Рыбацкае шчасце» апублікаваў у 1948 годзе ў полацкай абласной газеце «Бальшавіцкі сцяг». Пісаў пераважна пра вайну, сучаснасць, жыццё моладзі ў пасляваенны час. Таксама ёсць творы для дзяцей.

Аўтар кніг апавяданняў, аповесцей «Кедры глядзяць на мора» (1960), «Пасля паводкі» (1962), «Белы гарлачык» (1965), «Самы высокі паверх» (1969), дакументальнай аповесці «След пракладае першы» (1971), «Белая знічка» (1984), раманаў «Жанчына» (1963), «Палын – зелле горкае» (1967), «Верай і праўдай» (1976), «Толькі аднойчы» (1979), «Зямля раскажа» (1980), «Літасці не чакай» (1982), «Памерці заўсёды паспееш» (1983), «Верасы» (1987), «Обаль» (1989), кнігі нарысаў «На посту у тишины» (1987), зборніка апавяданняў для дзяцей «Шкляная нітка» (1970). У 1982 годзе выйшлі «Выбраныя творы» ў 2 тамах.

Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, «Знак Пашаны», Айчыннай вайны 1-й ступені, медалямі. Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі (1970) за аповесць «Самы высокі паверх». З 1987 года – Ганаровы грамадзянін г. Полацка.

Памёр Аляксандр Ануфрыевіч 5 кастрычніка 2015 года.

# Юбілейныя даты

**Калейдаскоп**
**студзень 2024**

## 17 студзеня 120 год з дня нараджэння Алеся Якімовіча




**АЛЕСЬ ЯКІМОВІЧ** ( Аляксандр Іванавіч; 17 студзеня 1904, в. Чурылава, Уздзенскі р-н, Мінская вобл. — 15 студзеня 1979) — пісьменнік, адзін з заснавальнікаў беларускай дзіцячай літаратуры, заслужаны дзеяч культуры Беларусі.

Нарадзіўся ў сялянскай сям'і. Старэйшы з шасцярых дзяцей, ён памагаў бацькам па гаспадарцы. Скончыўшы Вышэйшае пачатковае вучылішча ў мястэчку Узда і двухмесячныя настаўніцкія курсы (1921), вучыўся ў Белпедтэхнікуме (1921-1926). Неўзабаве малады літаратар стаў членам літаратурнай арганізацыі «Маладняк» (1923), працаваў адказным сакратаром рэдакцыі новага часопіса для школьнікаў «Беларускі піянер» (1924). З 1927 займаўся на літаратурна-лінгвістычным аддзяленні педфака БДУ, якое скончыў у 1930. Вучобу ва ўніверсітэце сумяшчаў з абавязкамі рэдактара, некаторы час працаваў сакратаром педагагічнага часопіса «Асвета», выкладчыкам беларускай мовы і літаратуры ў вячэрнім Тэхнікуме вогнетрывалага будаўніцтва.

У пачатку Вялікай Айчыннай вайны быў у эвакуацыі, працаваў настаўнікам у адной з сярэдніх школ г. Чыстапаля, адказным сакратаром раённай газеты ў сяле Шаманаіха Казахскай ССР. Адтуль у 1942 накіраваны на курсы малодшых лейтэнантаў у г. Андыжан, затым – на фронт. Пад Харкавам быў паранены (1943). Пасля выхаду са шпіталя пэўны час жыў у Маскве, займаўся рэдактарскай працай (1943-1944). Пасля вайны працаваў старшым рэдактарам Дзяржаўнага выдавецтва БССР (1944-1948), літкансультантам Саюза пісьменнікаў рэспублікі (1955-1960). Узнагароджаны двума ордэнамі Працоўнага Чырвонага сцяга, медалямі. Пачатак творчасці А. Якімовіча прыпадае на 20-я г. – парыяд станаўлення беларускай савецкай дзіцячай літаратуры. Вершы стаў пісаць у час вучобы ў Белпедтэхнікуме. Першае выступленне ў друку – верш «Вясна», надрукаваны ў 1923 у часопісе «Маладняк». У 1925 выйшлі першыя кнігі А. Якімовіча: «Вершы» і зборнік апавяданняў «Гул бубна», пазней выходзяць у свет аповесці, апавяданні, вершаваныя казкі. Алесь Якімовіч быў адным з пачынальнікаў тэмы заходнебеларускага жыцця ў дзіцячай літаратуры (апавяданне «Апоркі»). Асобную старонку творчай біяграфіі пісьменніка складае яго плённая дзейнасць у галіне мастацкай апрацоўкі беларускіх народных казак, у развіцці жанру літаратурнай казкі. Алесь Якімовіч – складальнік кнігі для чытання ў 2 класе «Роднае слова», а таксама артыкулаў па пытаннях развіцця дзіцячай літаратуры. Нямала зроблена ім і ў галіне перакладу. На вершы А. Якімовіча кампазітарамі А. Багатыровым, Н. Сакалоўскім напісаны песні.Памёр 15 студзеня 1979 года.

## 17 студзеня 60 год з дня нараджэння Андрэя Федарэнкі




**Андрэй Міхайлавіч Федарэнка** (17 студзеня 1964 г., в. Бярозаўка, Мазырскі раён, Гомельская вобласць) — беларускі празаік. Скончыў Мазырскі політэхнічны тэхнікум і Бібліятэчны факультэт Мінскага інстытута культуры (1985—1990).

Служыў у Савецкай Арміі. Працаваў мулярам у Мікашэвічах Лунінецкага раёна, на чыгунцы ў Калінкавічах Гомельскай вобласці, старшым бібліятэкарам Бярозаўскай бібліятэкі № 2 Мазырскага раёна, карэктарам штотыднёвіка «7 дней», загадчыкам аддзела навукі і мастацтва часопіса «Полымя», на кінастудыі «Беларусьфільм». У 2005—2011 гадах — загадчык аддзела прозы ў часопісе «Маладосць». У 2011—2012 гадах супрацоўнік аддзела прозы і паэзіі газеты «Літаратура і мастацтва». Цяпер стыль-рэдактар часопіса «Дзеяслоў».

Друкуецца з 1987 года. У аповесці «Гісторыя хваробы» (1989) сацыяльна-псіхалагічны партрэт сучаснай моладзі, у аповесці-фантасмагорыі «Смуга, альбо XII фантазій на адну тэму» (1994) жыццё сучаснага грамадства, якое страціла маральныя арыенціры, у аповесці «Вёска» (1995) філасофскі роздум над лёсам Беларусі і беларусаў. Аўтар аповесцей «Такое кароткае лета», «Ланцуг» (абедзве 1994), «Нічые» (2001), п’есы «Жаніх па перапісцы» (1993), публіцыстычных артыкулаў і інш. Дзецям і юнакам адрасаваны прыгодніцкія аповесці «Шчарбаты талер» (1999), «Афганская шкатулка» (2002).

Яго творчасці ўласцівы псіхалагічны аналіз, гуманістычны погляд на чалавека, драматызм, элементы фантастыкі, мастацкай ўмоўнасці, эмацыянальнасць, спавядальнасць. Перакладае з беларускай мовы на рускую.

# Літаратурная старонка



## Дзень добры, таварыш Студзень!

**Студзень -
не той студзень,
што ставяць на стол часамі.
Дружыць мы са Студзенем будзем -
вы гэта пабачыце самі...
Студзень -
самы першы
Сярод братоў-месяцаў.
Яму - і песні і вершы,
дзе ўся наша ўцеха змесціцца.
Хоць і марозны і колкі,
ён з намі карагодзіць
ля навагодняй ёлкі,
ёлкі -
чароўнай вясёлкі,
што ў кожны дом прыходзіць.
У бегу па лёдзе рыўкамі
нават завею суцішым:
мы на катку канькамі
вясёлую азбуку пішам...
А хто там,
паддаўшыся страху,
вягляд зрабіў горкі?
Смялей жа!
Ляці з размаху
на лыжах з высокай горкі!
Па густу прыгоды здаровым,
не боязна ім і ўпасці.
Куляцца ў снезе пуховым -
гэта таксама шчасце.
А тым, хто ўтрываць не можа
лыжнай імклівай гайданкі,
Студзень парадай паможа:
- Сядайце, сябры, на санкі!
Хоць і мароз прыпякае,
у бегу мы ног не застудзім.
З нас кожны шчасліва гукае:
- Дзень добры,
таварыш Студзень.**

**Пятрусь Макаль**

# Цікава ведаць

**Калейдаскоп**
**студзень 2024**






**Рэдкалегія: Кудраўцаў А.(9б),**
**Крупянкова А.(9б),**
**Фруцкая А.(9б),**
**Шаўцоў Д.(9б)**
**Рэдактар Юрчанка С.А.**